*Красавік 2022 г.*

# СПРАВАЗДАЧА ГРАМАДЗЯНСКІХ ІНІЦЫЯТЫВАЎ "ГОЛАС", "СУМЛЕННЫЯ ЛЮДЗІ", ZUBR ПРА Т. ЗВ. "РЭФЕРЭНДУМ" ПА ЎНЯСЕННІ ЗМЕНАЎ У КАНСТЫТУЦЫЮ БЕЛАРУСІ Ў 2022 г.

**Змест**


Уступ 1

Сітуацыя ў Беларусі на момант абвяшчэння "рэферэндуму"-2022 2

Кампанія "Перакрэслі рэферэндум – перакрэслі беззаконне" 2

Удзел грамадства ў падрыхтоўцы праекта паправак у Канстытуцыю 3

Збор дадзеных аб складах камісій па "рэферэндуме" на платформе ZUBR 3

Узаемадзеянне "Сумленных людзей" з чальцамі камісій па "рэферэндуме" 4

Грамадзянскі кантроль і назіранне на ўчастках па "рэферэндуме" 5

Віды парушэнняў на ўчастках па "рэферэндуме" 5

Альтэрнатыўнае онлайн-галасаванне на платформе "Голас" 7

Беларусы за мяжою 8

Аналіз пратаколаў вынікаў "рэферэндуму" 9

Асноўны дзень рэферэндуму – дзень пратэсту супраць вайны ва Украіне 10


## Уступ

Беларускія грамадзянскія ініцыятывы "Голас", "Сумленныя людзі" і ZUBR прадстаўляюць справаздачу па выніках грамадска-палітычнай кампаніі "Перакрэслі рэферэндум – перакрэслі беззаконне" у перыяд заяўленага ў Беларусі ў 2022 годзе "рэферэндуму" па ўнясенні зменаў у Канстытуцыю. Кампанія "Перакрэслі рэферэндум – перакрэслі беззаконне" праводзілася ініцыятывамі сумесна з аб'яднанымі беларускімі дэмакратычнымі сіламі – Офісам Святланы Ціханоўскай, Народным Антыкрызісным Упраўленнем і Каардынацыйнай Радай.

Платформа "Голас" была створаная беларускімі IT-спецыялістамі для кантролю за сумленнасцю выбараў у Беларусі і альтэрнатыўнага падліку галасоў. Суполка "Сумленныя людзі" – гэта грамадзянская ініцыятыва, якая займаецца працай па ўзаемадзеянні з грамадзянамі і чальцамі камісій у Беларусі, маніторынгам СМІ і г. д. Грамадзянская ініцыятыва ZUBR ажыццяўляе маніторынг працэсаў галасавання на выбарах і рэферэндумах у Беларусі – збор, сістэматызацыю і аналіз дадзеных аб парушэннях, падліку галасоў і падвядзенні вынікаў галасавання, складзе камісій усіх узроўняў і ўчастках для галасавання.

У справаздачы выкарыстоўваюцца і аналізуюцца дадзеныя, што паступілі падчас кампаніі ад грамадзян і з адкрытых рэсурсаў (публікацыі СМІ, звесткі праваабарончых арганізацый) аб падрыхтоўцы і ходзе "рэферэндуму". **Атрыманыя вынікі паказваюць на прынцыповую неправамернасць правядзення ў Беларусі ў названы перыяд якога б там ні было электаральнага працэсу ад пачатку і пацвярджаюць ідавочнае выкарыстанне нелегітымным рэжымам у Беларусі як ужо вядомых, так і новых механізмаў фальсіфікацый і маніпуляцый для стварэння нібыта адкрытасці і празрыстасці такога працэсу.**

## Сітуацыя ў Беларусі падчас абвяшчэння "рэферэндуму"-2022

Згодна з вынікамі праведзенага сярод беларусаў яшчэ ў кастрычніку 2020 года апытання на платформе "Голас" адносна магчымасці і неабходнасці ўнясення паправак у Канстытуцыю[1] , у якім узялі ўдзел 463594 чалавекі, 99,1% рэспандэнтаў лічылі, што да ўнясення якіх-небудзь зменаў у Канстытуцыю Беларусі неабходна выкананне трох асноўных патрабаванняў да дзяржаўнай сістэмы з боку грамадства:

- спыненне палітычнага пераследу грамадзян Беларусі з боку ўладаў, узбуджэнне крымінальных спраў, прыцягненне вінаватых да адказнасці;
- вызваленне ўсіх палітычных зняволеных, адмена неправамерных судовых пастаноў, выплата кампенсацый усім пацярпелым;
- прызнанне выбараў 9 жніўня 2020 года несапраўднымі і правядзенне новых выбараў па міжнародных стандартах з новым складам усіх камісій па выбарах, у тым ліку Цэнтрвыбаркаму.

Гэтыя патрабаванні з боку беларускага грамадства дзяржаўнай сістэмай Беларусі выкананыя не былі, грамадзяне, якія мірна выступілі з гэтымі патрабаваннямі, падвергліся рэпрэсіям і пераследу.

Напрыканцы студзеня 2022 года рэжым у Беларусі пад кіраўніцтвам нелегітымнага прэзідэнта Лукашэнкі абвясціў, што "рэферэндум" па зменах у Канстытуцыю мае адбыцца 27 лютага. На фоне масавых рэпрэсій, парушэнняў правоў чалавека, зачыстак грамадскай супольнасці і падаўлення свабоды слова ў Беларусі, а таксама, у прыватнасці, пераследу актыўных грамадзян, якія ажыццяўлялі незалежнае назіранне на выбарах 2020 года, відавочна, што абвяшчэнне даты рэферэндуму ў мінімальны тэрмін да даты галасавання тлумачыцца імкненнем рэжыму не дапусціць рост палітычнай і грамадскай актыўнасці ў перыяд кампаніі.

У сітуацыі, якая склалася, праваабарончыя арганізацыі адмовіліся накіроўваць кароткатэрміновых назіральнікаў на так званы "рэферэндум". Пра-дэмакратычныя палітычныя партыі таксама афіцыйна заявілі, што не будуць арганізоўваць назіранне на "рэферэндуме". Праваабарончы цэнтр "Вясна" і Беларускі Хельсінкскі камітэт у межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" аб'явілі аб адсутнасці магчымасці арганізаваць поўнамаштабнае назіранне з-за асцярогі за бяспеку назіральнікаў і запусцілі экспертную місію па назіранні за ходам "рэферэндума".

## Кампанія "Перакрэслі рэферэндум – перакрэслі беззаконне"

У сувязі з практычна поўнай адсутнасцю незалежнага назірання з удзелам мясцовых і міжнародных арганізацый (напрыклад, АБСЕ-БДІПЧ), "Голас", "Сумленныя людзі" і ZUBR сумесна з аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі аб'явілі кампанію "Перакрэслі рэферэндум – перакрэслі беззаконне" з мэтай адлюстравання сапраўднага стаўлення значнай часткі грамадзян да "рэферэндуму". Грамадзянам Беларусі было прапанавана рабіць свае бюлетэні несапраўднымі (перакрэсліць абодва варыянты ў бюлетэні ў знак непрызнання ўлады, якая праводзіць "рэферэндум") і ўдзельнічаць у грамадскім кантролі за тым, што адбываецца на ўчастках па "рэферэндуме".

Пры гэтым рэжым у Беларусі аказвае беспрэцэдэнтны ціск на ініцыятывы і грамадзян, якія ладзяць назіранне і грамадзянскі кантроль за падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў і рэферэндумаў. У перыяд падрыхтоўкі і правядзення "рэферэндуму" гэты ціск працягнуўся і ўзмацніўся. Са снежня 2021 года па люты 2022 года ў Беларусі супрацоўнікі сілавых органаў праводзілі масавыя ператрусы па месцы жыхарства і "прафілактычныя гутаркі" з грамадзянамі, якія ўдзельнічалі ў незалежным назіранні і супрацоўнічалі з ініцыятывамі "Голас", "Сумленныя людзі" і ZUBR падчас выбараў у 2020 годзе. На пачатку лютага 2022 года пракуратура Віцебскай вобласці заблакавала доступ да сайта кампаніі кааліцыі дэмакратычных сіл і грамадскіх ініцыятываў "Перакрэслі беззаконне – перакрэслі рэферэндум" xx.2022.org, дзе размяшчалася інфармацыя аб фальсіфікацыях на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года, а таксама спісы чальцоў камісій на "рэферэндуме". 8 лютага КДБ Беларусі прызнаў суполку "Сумленныя людзі" экстрэмісцкім фарміраваннем.

[1] Голас (golos2020.org)

## Удзел грамадства ў падрыхтоўцы праекта паправак у Канстытуцыю

Па дадзеных папярэдняй аналітычнай справаздачы узгаданай вышэй экспертнай місіі "Вясны" ад 28.02.2022[2], падрыхтоўка канстытуцыйнай рэформы і праекта паправак у Канстытуцыю праводзілася ў закрытым рэжыме, абмеркаванне ў дзяржаўных СМІ праходзіла фармальным чынам без уліку меркаванняў і патрабаванняў з боку грамадскасці. Працэс стварэння праекта Канстытуцыі на працягу 2020-2021 гг. быў закрытым, аўтары гэтага праекта застаюцца ананімнымі, зваротная сувязь ад грамадзян не ўлічвалася.

На фоне беспрэцэдэнтнага ціску на свабоду слова грамадскае абмеркаванне праекта было практычна зведзена да нуля: праект Канстытуцыі быў апублікаваны ў перадднавагодні перыяд у максімальна кароткі тэрмін перад датай рэферэндуму, прыём зваротаў і заяў ад грамадзян праходзіў фармальна. За адкрытае выказванне свайго меркавання грамадзяне падвяргаліся пераследу. Прыкладамі таму з'яўляюцца арышт 15 студзеня 2022 года пенсіянера Мікалая Віцікава[3], які выказаў сваё стаўленне да таго, што адбываецца, у лісце ў газету, а 21 студзеня – затрыманне Андрэя Дубіны[4], які, паводле слоў відавочцаў, падчас "грамадскага дыялогу" аб Канстытуцыі ў сваёй арганізацыі прапанаваў забараніць удзельнічаць у выбарах “вусатым і лысым людзям”.

## Збор дадзеных аб складах камісій па "рэферэндуме" на платформе ZUBR

Адной з асноўных задач ініцыятывы ZUBR з'яўляецца збор і сістэматызацыя інфармацыі аб выбарах і рэферэндумах у Беларусі, у тым ліку пра склады камісій усіх узроўняў. У 2022 годзе былі зробленыя спробы збору інфармацыі аб камісіях і ў перыяд т. зв. "рэферэндуму".

Згодна з выбарчым кодэксам, рашэнні аб фармаванні камісій публікуюцца ў сямідзённы тэрмін пасля іх прыняцця. У рашэнні пазначаюцца прозвішча, імя, імя па бацьку кожнага чальца камісіі, спосаб вылучэння ў склад камісіі, месца знаходжання і нумары тэлефонаў камісіі. Падчас выбараў 2020 года спісы складаў, адрасы і кантактныя дадзеныя тэрытарыяльных і ўчастковых камісій размяшчаліся на сайтах выканаўчых камітэтаў і ў друкаванай прэсе і былі даступныя абсалютна любому выбаршчыку. У 2022 годзе пастанова, якая рэгулюе парадак інфармавання грамадзян камісіямі па рэферэндуме і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі аб рабоце па падрыхтоўцы і правядзенні рэферэндуму, не была апублікаваная. Ёсць меркаванні, што частка пастаноў ЦВК 2022 года была схаваная ад грамадзян.

У адпаведнасці з пастановай ЦВК Беларусі ад 21.01.2022 №1 "Аб зацвярджэнні Каляндарнага плана арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь", не пазней за 25 студзеня 2022 года павінны былі быць сфармаваныя **тэрытарыяльныя камісіі па "рэферэндуму".**

Ужо з першых дзён фарміравання тэрытарыяльных камісій асобныя выканаўчыя і распарадчыя органы не размяшчалі інфармацыю аб камісіях у адкрытых крыніцах. У шэрагу выпадкаў на сайтах выканаўчых камітэтаў размяшчаліся толькі прозвішчы, імёны і імёны па бацьку старшыні, намесніка і сакратара, адрас, час працы і кантактны тэлефон тэрытарыяльных камісій. Было відавочна, што ўсе выканкамы Брэсцкай вобласці і некаторыя выканкамы Менскай вобласці затрымлівалі публікацыю гэтых звестак. У выніку так і не ўдалося атрымаць дадзеныя аб складах тэрытарыяльных камісій шэрагу раёнаў Брэсцкай вобласці (Ленінскі і Маскоўскі раёны г. Брэста, Брэсцкі, Ганцавіцкі, Жабінкаўскі, Маларыцкі і Лунінецкі раён), Гомельскай вобласці (Жыткавіцкі раён), Менскай вобласці (Менскі і Старадарожскі раён). Магілёўскай вобласці (Бялыніцкі раён).

Сітуацыя з публікацыяй дадзеных **участковых камісій па “рэферэндуму”** была яшчэ горшай. Пасля іх фарміравання гэтыя дадзеныя не былі апублікаваныя на сайтах мясцовых выканаўчых камітэтаў (як гэта адбывалася ў 2020 годзе і раней), хаця згодна з выбарчым кодэксам склады камісій

---

[2] Папярэдняя аналітычная справаздача экспертнай місіі па ацэнцы рэспубліканскага рэферэндуму | Праваабаронцы за свабодныя выбары 2022 (spring96.org)

[3] Да пяці гадоў калоніі. Прапановы пенсіянера па канстытуцыйнай рэформе кваліфікавалі як распальванне варожасці ( spring 96. org )

[4] Другое затрыманне, звязанае з абмеркаваннем праекта Канстытуцыі - у Высокім? | Навіны Беларусі | euroradio . fm

мусяць публікавацца ў сямідзённы тэрмін. Мясцовыя друкаваныя выданні, у якіх усё ж публікаваліся рашэнні аб фармаванні камісій, змяшчалі няпоўныя дадзеныя аб камісіях (толькі нумары ўчасткаў, адрасы і кантактныя тэлефоны камісій). Такім чынам, выбаршчыкі не маглі даведацца пра склад сваёй тэрытарыяльнай і ўчастковай камісіі ў адпаведнасці з заканадаўствам. Гэта таксама парушае прынцып галоснасці пры правядзенні рэферэндумаў, закладзены ў выбарчым кодэксе.

Пасля заканчэння максімальнага тэрміну на публікацыю рашэнняў выканаўчых камітэтаў аб фарміраванні камісій грамадзянскія актывісты, у тым ліку пад каардынацыяй ініцыятыў “Сумленныя людзі” і ZUBR, распачалі спробы ўдакладніць, дзе публікуюцца дадзеныя аб камісіях. У размовах з прадстаўнікамі ініцыятыў асобныя работнікі выканаўчых камітэтаў раёнаў паводзілі сябе агрэсіўна і нават часам пагражалі адказнасцю за запыты на інфармацыю. У адказ на адзін з такіх запытаў на гарачую лінію ЦВК быў атрыманы адказ аб тым, што ЦВК прыняла рашэнне "засакрэціць імёны чальцоў участковых камісій"[5] . Дадзенае рашэнне не мае законных падстаў, бо парушае артыкулы 13 і 34 выбарчага кодэкса, акрамя таго, сведчыць аб перавышэнні членамі ЦВК сваіх паўнамоцтваў, што можа разглядацца як крымінальнае злачынства. Адпаведная пастанова ЦВК так і не была апублікаваная.

Такім чынам, выкарыстоўваючы звесткі з нешматлікіх публікацый у адкрытых крыніцах, а таксама з пратаколаў і паведамленняў, атрыманых ад грамадзян праз чат-боты на ўмовах ананімнасці, ініцыятыве ZUBR атрымалася ажыццявіць збор дадзеных аб участках па “рэферэндуме”. **Выніковая колькасць участкаў склала 5 510, усіх камісій – 5 664,** але пры гэтым удалося ўстанавіць толькі невялікую частку складаў камісій па "рэферэндуму": **вядомыя дадзеныя крыху больш за 2 700 чальцоў гэтых камісій.** Для параўнання, у 2020 годзе на платформе ZUBR былі адлюстраваныя дадзеныя ўсіх без выключэння членаў 5920 камісій па выбарах – іх колькасць тады склала каля 65 000.




### Узаемадзеянне "Сумленных людзей" з чальцамі камісій па "рэферэндуме"

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення "рэферэндуму" адным з напрамкаў работы ініцыятывы "Сумленныя людзі" было ўзаемадзеянне з чальцамі камісій на ўчастках. За перыяд са снежня 2021 года на сувязь з ініцыятывай "Сумленныя людзі" выйшлі **163 чалавекі**, якія паведамілі аб сваім удзеле ва ўчастковых камісіях. З прычыны рызык, звязаных з бяспекай, верыфікацыя гэтых людзей праз асабістыя дадзеныя не ўяўлялася магчымай. Як зрабілася вядома пазней, не менш за 11 са 163 тых, хто звярнуўся, выдавалі сябе за чальцоў камісій, хаця самі з'яўляліся супрацоўнікамі дзяржаўных СМІ Беларусі, якія спрабавалі дэзінфармаваць ініцыятыву і тым самым дыскрэдытаваць паведамленні ад іншых крыніц. Пры складанні справаздачы паведамленні ад гэтых крыніц былі праігнараваныя. У аўтараў справаздачы няма падстаў не давяраць інфармацыі, атрыманай ад

[5] ЦВК засакрэціла імёны чальцоў участковых камісій. Юрыст лічыць, гэта прамое парушэнне заканадаўства (zerkalo.io)

астатніх грамадзян. Тым не менш, верыфікаваць дадзеныя і іх крыніцы, якія паступілі ад іх, цяпер не ўяўляецца магчымым дзеля бяспекі гэтых грамадзян.

Па паведамленнях ананімных крыніц "Сумленных людзей" у камісіях, на некаторых участках камісіі былі фактычна сфарміраваныя яшчэ ў снежні 2021, то бок за месяц да аб'яўлення даты "рэферэндуму". Былі атрыманыя паведамленні пра як мінімум **25 фактаў ціску на чальцоў камісій** з боку кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў з мэтай прымусу да ўдзелу ў камісіях. Работнікам пагражалі непадаўжэннем кантрактаў, звальненнямі, пазбаўленнем бацькоўскіх правоў і крымінальнай адказнасцю. Па нашай інфармацыі, нярэдка ў склад камісій траплялі лаяльныя ці ўразлівыя супрацоўнікі, напрыклад, маці-адзіночкі, якія не могуць дазволіць сабе страціць працу. Спісы чальцоў камісій прайшлі тры этапы ўзгаднення на прадмет “добранадзейнасці” з удзелам раённых і абласных выканаўчых камітэтаў і КДБ.

Грамадзяне, якія назваліся чальцамі камісій, паведамлялі “Сумленным людзям”, што ўлады арганізавалі кампанію па недапушчэнні супрацоўніцтва чальцоў камісій з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці. На агульных сходах і ў асабістых гутарках кіраўнікі прадпрыемстваў пагражалі падначаленым з ліку чальцоў камісій крымінальнай адказнасцю за супрацоўніцтва з грамадзянскімі ініцыятывамі ці “уцечку” любой інфармацыі. Пагрозы падзейнічалі і прывялі да сітуацыі, калі толькі **13 з 163** чальцоў камісій, якія звязаліся з “Сумленнымі людзьмі”, **паведамілі пра ход галасавання і падлік галасоў**.

## Грамадзянскі кантроль і назіранне на ўчастках па "рэферэндуме"

У перыяд кампаніі па “рэферэндуме” ініцыятыва ZUBR прадставіла грамадзянам адукацыйныя матэрыялы і інструмент у выглядзе чат-бота ў Telegram для фіксацыі інцыдэнтаў, якія маглі ўказваць на парушэнні выбарчага заканадаўства. Сувязь з актыўнымі грамадзянамі ажыццяўлялася на ўмовах ананімнасці з мэтай гарантаваць іх бяспеку. Такім чынам, сабраныя дадзеныя аб працэсе галасавання, атрыманыя з адкрытых крыніц, а таксама ад простых выбаршчыкаў і незалежных назіральнікаў праз чат-бот ZUBR, з'яўляюцца добраахвотнымі і ананімнымі паведамленнямі карыстальнікаў пра магчымыя парушэнні выбарчага заканадаўства, што робіць верыфікацыю такіх паведамленняў практычна немагчымай.

Усяго **з чат-ботам ZUBR адбылося каля дзвюх тысяч узаемадзеянняў – 1 834 у якасці грамадскіх кантралёраў, 96 – у якасці назіральнікаў.** Агульны лік дасланых у чат-бот ZUBR **паведамленняў аб парушэннях – 408** (пры гэтым некаторыя паведамленні змяшчалі інфармацыю аб некалькіх магчымых парушэннях адразу). **Атрымана 96 пратаколаў** – і датэрміновага галасавання, і выніковых за 27 лютага.

Невялікая колькасць паведамленняў ад грамадзян, чальцоў камісій, грамадскіх кантралёраў і назіральнікаў, атрыманых грамадзянскімі ініцыятывамі, не сведчыць ні пра дэпалітызацыю грамадства, ні пра нізкую цікавасць да дэмакратыі. Актыўны ўдзел у электаральнай кампаніі ў Беларусі ў перыяд “рэферэндуму” азначаў неадпаведна высокую пагрозу свабодзе і бяспецы з-за рэпрэсій з боку рэжыму. Гэтыя лічбы сведчаць перш за ўсё пра канчатковую дэградацыю выбарчай сістэмы Беларусі з пункту гледжання адкрытасці і галоснасці.

Пры гэтым нават параўнальна невялікая колькасць паведамленняў, якія паступілі ў чат-бот ZUBR, дазваляе сцвярджаць, што камісіі і зноў карысталіся звыклымі метадамі штучнага завышэння яўкі і фальсіфікацыі вынікаў галасавання. Акрамя таго, грамадзяне паведамлялі ў ZUBR і пра пэўныя "інавацыі" з боку камісій (далей падрабязна).

## Віды парушэнняў на ўчастках па "рэферэндуме"

Парушэнні выбарчага заканадаўства, паведамленні пра якія паступілі ў чат-бот ZUBR за ўсе шэсць дзён галасавання, размеркаваліся наступным чынам:

1. невыкананне ўмоў для забеспячэння таямніцы галасавання (246);
2. незахаванне санітарных нормаў на ўчастку (111);
3. прымус да галасавання (27);
4. пазбаўленне права голасу (адсутнасць магчымасці галасаваць у беларусаў за мяжой) (26);
5. невывешванне копіі пратакола ва ўстаноўлены тэрмін (17);
6. адмова ў акрэдытацыі назіральніка (5);
7. неадпаведнасць дадзеных пра тых, хто прагаласаваў, па падліках назіральніка дадзеным пратакола (4);
8. маніпуляцыі са спісамі выбаршчыкаў (4)
9. іншае (18).




Самая вялікая колькасць паведамленняў датычыцца **парушэння таямніцы галасавання** ў сувязі з адсутнасцю фіранак і нават сценак у кабінах разам з размяшчэннем сталоў такім чынам, каб дзеянні выбаршчыка максімальна "праглядаліся" чальцамі камісій. Несумненна, гэта было выклікана страхам рэжыму перад любымі спробамі альтэрнатыўнага падліку галасоў праз фатаграфаванне бюлетэняў, хаця фармальна і матывавалася прафілактыкай каронавіруса. Разам з тым грамадзяне масава паведамлялі ў ZUBR аб невыкананні чальцамі камісій такіх базавых санітарных нормаў, як нашэнне маскі. Такім чынам, наўпроставыя парушэнні выбарчага кодэкса ў выглядзе незабеспячэння таямніцы галасавання і абмежавання колькасці назіральнікаў на ўчастках ЦВК тлумачыла прафілактыкай каранавіруса, аднак сапраўды неабходныя і базавыя меры бяспекі ў выглядзе нашэння масак чальцы камісій не выконвалі.

У чат-бот ZUBR паступіла некалькі паведамленняў аб незаконным пазбаўленні акрэдытацыі назіральнікаў камісіямі. У некаторых выпадках такія інцыдэнты завяршаліся яшчэ і правядзеннем прафілактычнай гутаркі з назіральнікам у міліцыі.

Чальцы камісій выкарыстоўвалі розныя метады для штучнага завышэння яўкі, каб, відаць, дасягнуць лічбаў, якія “спускалі” ім выканкамы (як гэта адбывалася ў 2020 годзе[6]). У прыватнасці, у чат-бот ZUBR паведамлялася аб маніпуляцыях са спісамі выбаршчыкаў. Напрыклад, члены камісій прасілі грамадзян, якія атрымлівалі бюлетэнь, не пазначаць дату галасавання ў спісах. Можна меркаваць, што даты яны прадстаўлялі пазней самі, выконваючы нейкі “план” па яўцы ў розныя дні датэрміновага галасавання. Паведамлялася таксама аб практычна пустых спісах без подпісаў на ўчастках у вобласці, дзе па афіцыйных дадзеных датэрміновая яўка складала на той момант каля 40%.

Паведамленні аб прымусе да галасавання ў чат-бот ZUBR паступілі з участкаў у Мінску, Горадні, Рэчыцы, Гомелі, Полацку, Століне, Калінкавічах, Касцюковічах, Оршы, Віцебску, Магілёве, Мядзельскім і Баранавіцкім раёнах. Да галасавання прымушалі студэнтаў, якім або пагражалі высяленнем з інтэрната, або прапаноўвалі выхадныя дні за наведванне ўчастку, і прадстаўнікоў іншых традыцыйна ўразлівых у гэтым сэнсе катэгорый – работнікаў дзяржпрадпрыемстваў, чальцоў БРСМ, асуджаных з папраўчых устаноў адкрытага тыпу. Прымус да галасавання парушае прынцып

[6] Старшыня камісіі: як патрабуюць “палічыць” - ZUBR

свабоднага ўдзелу ў рэферэндуме, адлюстраваны ў артыкуле 5 выбарчага кодэкса, а таксама шэраг міжнародных стандартаў (артыкул 25 МПГПП і параграф 7.7 Капенгагенскага дакумента АБСЕ).

Паведамленні ў чат-бот ZUBR пра тое, што камісіі на шэрагу ўчасткаў не вывешвалі копіі пратаколаў і датэрміновага галасавання, і за асноўны дзень галасавання без тлумачэнняў, пацвярджаюць сумныя тэндэнцыі 2020 года. Так, грамадзяне, якія паспрабавалі азнаёміцца з вынікамі галасавання на ўчастках паведамлялі, што або так і не дачакаліся вывешвання выніковых пратаколаў, або не здолелі атрымаць да іх доступ, хаця пратакол павінен быць вывешаны для ўсеагульнага азнаямлення. Такія практыкі з'яўляюцца наўпроставым парушэннем выбарчага заканадаўства Беларусі, а таксама міжнародных стандартаў (параграф 7.4 Капенгагенскага дакумента АБСЕ).

Гэтыя факты, разам з нагруднымі бэйджыкамі, перавернутымі пустым бокам ці з надпісам “чалец камісіі” без прозвішча, імя і імя па бацьку, пра якія паведамлялася ў чат-бот ZUBR, сведчаць аб імкненні **схаваць не толькі афіцыйныя “вынікі” галасавання, але і дадзеныя чальцоў камісій,** якія пазначаюцца ў пратаколах. Маюцца паведамленні аб выпадках, калі на просьбу прадстаўніцца чальцы камісіі называлі толькі імя (без прозвішча) ці звярталіся да міліцыянта, які дзяжурыў на ўчастку, які патрабаваў пакінуць участак ад таго, хто агучыў такую просьбу.

## Альтэрнатыўнае анлайн-галасаванне на платформе “Голас”

Грамадзянам, якія зарэгістраваліся на платформе “Голас” пры дапамозе беларускага нумара тэлефона ці беларускага пашпарта, падчас “рэферэндуму” было прапанавана пацвердзіць анлайн сваё дзеянне на ўчастку з мэтай альтэрнатыўнага падліку.

У гэтым анлайн-галасаванні прынялі ўдзел 200 788 карыстальнікаў з Беларусі (2,95% удзельнікаў “рэферэндуму”, калі дапусціць, што дадзеныя ЦВК пра 6 810 166 удзельнікаў адпавядаюць рэчаіснасці). З іх 110 869 (55,22% ад колькасці тых, хто прагаласаваў на платформе "Голас") паведамілі, што зрабілі свой бюлетэнь несапраўдным, 4 309 карыстальнікаў (2,15% ад колькасці прагаласаваўшых на платформе "Голас") прагаласавалі "ЗА" прыняцце змяненняў і дапаўненняў да Канстытуцыі, 14 315 (7,13% ад колькасці тых, хто прагаласаваў платформе “Голас”) прагаласавалі “СУПРАЦЬ”, 71 295 (35,50% ад колькасці тых, хто прагаласаваў на платформе “Голас”) не прыйшлі на ўчасткі.




Толькі 21 174 карыстальнікаў (16%) з 129 493 тых, хто прагаласаваў на платформе “Голас” як тыя, хто быў гатовы прыйсці і (ці) прыйшоў на ўчасткі, здолелі зрабіць і даслаць фота сваіх бюлетэняў. Гэтая доля ў 16% вельмі значна адрозніваецца ад долі тых, хто сфатаграфаваў свой бюлетэнь на выбарах 2020 года – фатаграфіі тады даслалі больш за 50% удзельнікаў анлайн-галасавання на платформе "Голас".




Такая розніца тлумачыцца рэпрэсіямі і атмасферай страху: падчас кампаніі "Перакрэслі рэферэндум – перакрэслі беззаконне" многія беларусы адзначалі, што баяцца рабіць бюлетэнь несапраўдным ці рабіць фатаграфію бюлетэня з-за страху пераследу з боку рэжыму Лукашэнкі.

## Беларусы за мяжою

Беларусаў, якія знаходзяцца і пражываюць за межамі краіны, рэжым фактычна пазбавіў права голасу, вырашыўшы не ствараць участкі па "рэферэндуме" пры пасольствах і консульствах. Адной з прычын ЦВК назвала "нязначную колькасць грамадзян, якія знаходзяцца на консульскім уліку"[7] , хаця, паводле артыкулу 18 выбарчага кодэкса, стварэнне ўчасткаў на тэрыторыі замежных дзяржаў не можа залежаць ад гэтага фактара. Іншую прычыну адсутнасці ўчасткаў за мяжой МЗС Беларусі пазначыла як неабходнасць гарантаваць бяспеку супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў ад правакацый. Аднак, якія б прычыны гэтага рашэння ЦВК і МЗС ні агучвалі, без фармальнай ацэнкі неабходнасці абмяжоўваць выбарчыя правы складана меркаваць пра правамернасць такіх крокаў з пункту гледжання абароны правоў грамадзян. Такой ацэнкі ні ЦВК, ні МЗС не далі. Па дадзеных з розных крыніц, дзясяткі тысяч актывістаў вымушаныя былі пакінуць краіну з-за ціску і рэпрэсій (напрыклад, на люты 2022 г. толькі ў Польшчы пражывала 42,2 тыс. беларусаў з дзеючымі дазволамі на пражыванне[8]). Паведамленні ў чат-бот ZUBR ад грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца за межамі краіны, пацвярджаюць парушэнні з **пазбаўленнем іх права голасу** ў сувязі з немагчымасцю наведаць участкі па месцы жыхарства, як прапанавала ЦВК.

Платформа “Голас” арганізавала анлайн-галасаванне для беларускіх грамадзян, якія знаходзяцца за мяжой. Беларускія грамадзяне з замежнымі нумарамі тэлефона маглі прайсці верыфікацыю па пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусі і адзначыць, які варыянт галасавання на "рэферэндуме" яны абралі б, калі б участкі за мяжой былі адкрытыя. У апытанні прынялі ўдзел 25 458 грамадзян, з якіх 960 (3,77% апытаных на платформе “Голас”) прагаласавалі б “ЗА” за прыняцце змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі, 6 388 (25,09% апытаных на платформе “Голас”) – "СУПРАЦЬ"; 15 964 (62,71%) зрабілі б свой бюлетэнь несапраўдным, а 2 146 (8,43% апытаных на платформе "Голас") – не галасавалі б.

[7] Telegram: Contact @cikbelarus
[8] https://t.me/supermova/1438

**Анлайн-галасаванне беларусаў за мяжою**




## Аналіз пратаколаў вынікаў "рэферэндуму"

**Усяго з 5 510 участкаў на платформы ZUBR і "Голас" паступіла 79 выніковых пратаколаў участковых камісій за 27 лютага** з афіцыйнымі лічбамі па "рэферэндуме". Для параўнання: пасля выбараў у 2020 годзе колькасць выніковых пратаколаў, якія паступілі ў ZUBR, склала 1 310. Найбольш верагодныя прычыны такой невялікай колькасці атрыманых пратаколаў па "рэферэндуме" – і мізэрная колькасць незалежных назіральнікаў, і страх рэпрэсій за любыя крокі ці дзеянні, якія рэжым разглядае як "падазроныя" ці аб'яўляе "неправамернымі" (напрыклад, фатаграфаванне на ўчастку), і той факт, што пратаколы ў большасці выпадкаў на ўчастках не вывешвалі, які пацвярджаецца паведамленнямі грамадзянскіх кантралёраў у чат-бот ZUBR.

Дадзеныя "Голаса" пры параўнанні з пратаколамі паказваюць на верагоднасць фальсіфікацый на асобных участках. Так, напрыклад, на ўчастку №93 у Горадні колькасць карыстальнікаў, якія паведамілі, што зрабілі свой бюлетэнь несапраўдным, перавышае колькасць несапраўдных бюлетэняў з выніковага пратакола (72 у "Голасе" супраць 20 у пратаколе). Больш за тое, колькасць дасланых фота несапраўдных бюлетэняў на гэтым участку перавышае колькасць несапраўдных бюлетэняў у пратаколе (23 фота несапраўдных бюлетэняў у "Голасе"). Колькасць удзельнікаў "рэферэндуму", якія зрабілі свой бюлетэнь несапраўдным, перавышае лічбы несапраўдных бюлетэняў, пазначаныя ў пратаколах на ўчастку №4 у Ганцавічах, участку №14 у а. г. Лясны, участках №10, №23 і №27 у Маскоўскім раёне Мінска, участку №73 Першамайскага раёна Мінска, участку №23 Цэнтральнага раёна Мінска, участку №17 у а. г. Хацюхова Крупскага раёна Мінскай вобласці. Дадзеныя па гэтых участках дазваляюць зрабіць выснову аб фальсіфікацыях у выніках падліку галасоў.

Намаганнямі платформаў "Голас" і ZUBR і супольнасці "Сумленныя людзі" апрацаваныя дадзеныя з усіх атрыманых ад грамадзян выніковых пратаколаў. У 5 з 79 пратаколаў былі знойдзены арыфметычныя неадпаведнасці. На ўчастках для галасавання №27 Маскоўскага раёна і №10 Завадскога раёна ў Менску агульная колькасць тых, хто прагаласаваў падчас датэрміновага галасавання, дома і ў дзень галасавання не адпавядае агульнай колькасці ўдзельнікаў рэферэндуму ў пратаколе. Згодна з пратаколамі ўчастка для галасавання №19 у Ленінскім раёне Горадні, участка №12 у в. Бакшты Іўеўскага раёна і Чацвёртага Капішчанскага ўчастка №26 у Менскім раёне сума галасоў "ЗА", "СУПРАЦЬ" і несапраўдных бюлетэняў не адпавядае агульнай колькасці бюлетэняў у скрынях для галасавання.

Акрамя таго, назіральнікі, што вялі падлік грамадзян, якія галасавалі, паведамлялі ў чат-бот ZUBR аб значным **завышэнні рэальнай колькасці грамадзян, якія атрымалі бюлетэні, у пратаколах**

**датэрміновага галасавання**. Так, па паведамленнях з Менскай вобласці ў першы ж дзень у адным з выпадкаў камісія завысіла колькасць тых, хто прагаласаваў на ўчастку больш чым у тры разы, а ў іншым – напалову. Пры гэтым назіральнікі адзначалі, што часам лічбы ў выніковых пратаколах значна перавышалі не проста колькасць грамадзян, якія прагаласавалі, але і агулам людзей, якія наведвалі будынак участка на працягу дня. Акрамя таго, былі выпадкі, калі з колькасцю тых, хто прагаласаваў па пратаколе атрымліваецца, што на ўчастку галасаванне адбывалася бесперапынна ўвесь дзень з інтэрвалам паміж выдачай бюлетэняў максімум у 3 хвіліны.

Па дадзеных чальцоў камісій, якія звярнуліся да “Сумленных людзей”, падчас датэрміновага галасавання як мінімум на 2-х участках выніковыя дадзеныя пра яўку былі сфальсіфікаваныя ў бок павялічвання. На гэтых участках колькасць удзельнікаў рэферэндуму, якія атрымалі бюлетэні, у пратаколе кожнага з дзён датэрміновага галасавання магла адрозніваецца ад рэальнага ад 20% да больш як утрая. На працягу асноўнага дня галасавання як мінімум на 3-х участках члены камісій па ўказанні кіраўніцтва паставілі подпісы пад выніковым пратаколам яшчэ да пачатку падліку. Пазней вынікі галасавання былі ўнесены ў пратакол старшынямі камісій. Яшчэ на 2-х участках вынікі галасавання былі сфальсіфікаваныя на этапе падліку. Падобныя практыкі фальсіфікацыі яўкі супярэчаць выбарчаму заканадаўству Беларусі, а таксама прынцыпу сумленнасці падвядзення вынікаў выбараў, якую прадугледжваюць міжнародныя стандарты.

### Асноўны дзень рэферэндуму – дзень пратэсту супраць вайны ва Украіне

З 24 лютага напад Расійскай Федэрацыі на Украіну, у тым ліку з выкарыстаннем тэрыторыі Беларусі, практычна цалкам зрушыў фокус грамадскай увагі на ваенныя дзеянні, а так званы “рэферэндум” канчаткова страціў усялякія прыкметы легітымнасці.

25 лютага, на фоне ўварвання Расійскай Федэрацыі ва Украіну і прадастаўлення Рэспублікай Беларусь сваёй тэрыторыі для гэтага ўварвання, кааліцыя дэмакратычных сіл заклікала грамадзян прыходзіць на ўчасткі для галасавання 27 лютага ў 14.00, станавіцца ў чаргу за бюлетэнямі і рабіць бюлетэні несапраўднымі ў знак пратэсту супраць вайны.

27 лютага з відэазваротам да беларусаў выступіў прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі. Ён заявіў, што добрасуседскія адносіны беларусаў і ўкраінцаў – пад вялікай пагрозай, і заклікаў народ Беларусі зрабіць правільны выбар.

Па дадзеных чальцоў камісій, якія звярнуліся ў ініцыятыву “Сумленныя людзі”, як мінімум на 4-х участках быў арганізаваны **кантроль за волевыяўленнем** грамадзян, якія паслухаліся заклiку прыйсці да названага часу. Па іх паведамленнях, кіраўніцтва загадала фіксаваць прозвішчы і імёны тых удзельнікаў "рэферэндуму", якія прыходзілі на выбарчыя ўчасткі бліжэй да 14-й гадзіны. Паведамленні грамадзянскіх кантралёраў у чат-бот ZUBR пра прастаўленне чальцамі камісій адзнак алоўкам у спісах выбаршчыкаў, якія паказваюць на час атрымання бюлетэняў грамадзянамі ў асноўны дзень галасавання, прысутнасць на ўчастку ўзмоцненых нарадаў супрацоўнікаў міліцыі і дружыннікаў і вядзенне імі відэаздымак, спробы разагнаць людзей, якія мірна стаяць каля ўчастку, сведчаць пра **ціск і запалохванне грамадзян** падчас “рэферэндуму” з парушэннем заканадаўства.

Асноўны чат-бот зваротнай сувязі ZUBR быў адмыслова асобна падрыхтаваны для прыёму паведамленняў аб тым, ці адбываецца на ўчастках 27 лютага штосьці акрамя галасавання. Паведамленні ад грамадзян з фота- і відэаматэрыяламі, якія паступілі ў чат-боты ZUBR для грамадзянскага кантролю і для зваротнай сувязі, пацвярджаюць, што ў асноўны дзень “рэферэндуму” дзясяткі тысяч беларусаў на ўчастках не толькі рабілі бюлетэні несапраўднымі, выказваючы свой пратэст супраць так званага “рэферэндуму”. Сабраўшыся разам а 14:00, беларусы ў поўны голас выказаліся супраць вайны надпісамі "Не вайне" на бюлетэнях, скандаваннем лозунгаў, натоўпамі і доўгімі чэргамі ля ўчасткаў.

Па паведамленнях беларускага МУС і праваабаронцаў, за мірныя антываенныя выступленні 27 лютага, 28 лютага і ў некалькі наступных дзён затрымана блізу 1 000 беларусаў. Большасць з іх асуджаныя на адбыванне адміністрацыйных арыштаў і (ці) выплату буйных штрафаў.

**З улікам таго, што ва ўмовах рэпрэсій і вайны правядзенне любога народнага волевыяўлення ў прынцыпе не з'яўляецца магчымым, сапраўдным выбарам беларусаў з'яўляецца пратэст як супраць уласна "рэферэндуму", арганізаванага нелегітымнай з 2020 года ўладай, так і супраць вайны, у якой гэтая нелегітымная ўлада дае тэрыторыю Беларусі для знаходжання і перамяшчэння расійскіх войск і іх нападу на Украіну.**

**Ініцыятывы "Голас", "Сумленныя людзі" і ZUBR выказваюць шчырую ўдзячнасць і глыбокую павагу ўсім грамадзянам Беларусі, якія адгукнуліся на заклік да ўдзелу ў грамадзянскім кантролі ў перыяд кампаніі і дасылалі інфармацыю, рызыкуючы сваёй свабодай і бяспекай ва ўмовах рэпрэсій і падаўлення грамадзянскай актыўнасці.**